# ТАВАРЫШ ЯН

**Да 80-годдзя з дня нараджэння Я. Б. ГАМАРНІКА**

Яму ледзь споўнілася 23 гады, а ён ужо ўзначальваў Кіеўскі камітэт РСДРП(б), быў выбраны сакратаром Кіеўскага губкома партыі.

Ішла грамадзянская вайна. Над Савецкай рэспублікай навісла смяротная небяспека. Каб не дапусціць аб'яднання пятлюраўцаў з дзенікінцамі, 45, 47 і 58-я стралковыя дывізіі былі зведзены ў паўднёвую групу 12-й арміі. Камандуючым групай стаў легендарны герой грамадзянскай вайны Іона Якір, а ў Рэўваенсавет групы ўвайшлі Ян Гамарнік, Лаўрэн Картвелішвілі, Уладзімір Затонскі.

Паўднёвая група прарвала дзянікінска-пятлюраўскае кальцо ад Адэсы да Кіева, вызваліла Кіеў.

...Мінаў 1928 год. Савецкая краіна ажыццяўляла рашэнні XIV і XV з'ездаў ВКП(б) аб індустрыялізацыі і калектывізацыі сельскай гаспадаркі. У гэты час Яна Гамарніка накіроўваюць у Беларусь, дзе ён стаў першым сакратаром ЦК КП(б)Б. Гамарнік мабілізуе партыйную арганізацыю рэспублікі на будаўніцтва Гомсельмаша, Бабруйскага дрэваапрацоўчага камбіната, Віцебскай і Мінскай швейных фабрык і шэрагу іншых прадпрыемстваў, на пашырэнне дарожнай сеткі савецкай Беларусі.

Пад яго кіраўніцтвам у Беларусі былі пачаты вялікія работы па ўмацаванню заходніх граніц нашай Радзімы. Праслаўлены герой грамадзянскай вайны, ён увесь час цікавіўся жыццём Чырвонай Арміі, сябраваў з многімі палкаводцамі. У 1929 г. Я. Б. Гамарнік прымае ўдзел у асенніх усеармейскіх манеўрах, якія праходзілі на тэрыторыі Беларусі.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы

Э. ІОФЕ.